Настаўніцкая газета
23 чэрвеня 2012 года



Навука

# Роль Акадэміі навук — у ініцыятывах і стварэнні новых галін эканомікі

***Нацыянальная акадэмія навук Беларусі павінна выконваць ролю магутнай навукова-вытворчай карпарацыі, пляцоўкі для ўзгаднення і каардынацыі навуковай і інавацыйнай дзейнасці. Аб гэтым заявілі ў інтэрв'ю газеце "Веды" прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч, паведамілі ў прэс-службе ўрада.***

Роля Акадэміі навук заключаецца ў тым, каб быць лідарам у ініцыятывах і практычным стварэнні новых галін эканомікі. Сёння, напрыклад, магутны імпульс дадзены развіццю біятэхналогій. "Калі размова ідзе аб гэтым, то многія ўспрымаюць біятэхналогіі як нешта віртуальнае, не зусім зразумелае з практычнага пункта гледжання. На самай справе тут канкрэтная і прыкладная накіраванасць для нашай краіны", — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

Далейшае развіццё эфектыўнага раслінаводства і жывёлагадоўлі без біятэхналогій немагчыма. Асабліва калі стаіць задача выхаду на высокія ўзроўні прадукцыйнасці сельгаскультур і жывёл. "Без геннай інжынерыі тут проста не абысціся. І я думаю, што не трэба палохаць адзін аднаго генна-мадыфікаванай прадукцыяй. Работы ў гэтай сферы павінны гарантаваць яе бяспеку і карысць, — дадаў ён. — Айчынныя генетыкі, біёлагі павінны сказаць тут сваё важкае слова, тым больш што аўтарытэтных акадэмікаў, вучоных з доктарскімі ступенямі і прафесарскімі званнямі ў гэтай галіне ў нас нямала". Яны павінны ўнесці свой важкі ўклад у рост сельгасвытворчасці Беларусі. Бо да цяперашняга высокага яго ўзроўню дадатковы прырост можна атрымаць толькі з выкарыстаннем інтэнсіўных інавацыйных тэхналогій бія- і геннай мадыфікацыі, бяспечных для спажыўцоў сельгаспрадукцыі. Стаіць задача, каб прабіётыкі, прэпараты крыві, ферменты, мікробныя ўгнаенні і многія іншыя віды біятэхналагічнай прадукцыі, якія раней цалкам імпартаваліся, да 2015 года пачалі вырабляцца ў рэспубліцы і пакрываць амаль 80—100 працэнтаў ад унутранай патрэбнасці. Павінен расці і іх экспарт.

Аналагічная задача стаіць у фармацэўтыцы. Вытворчасць імпартазамяшчальных фармсубстанцый і дарагіх проціпухлінных прэпаратаў па поўным інавацыйным цыкле павінна быць маштабна арганізавана ў НПЦ НАН Беларусі.

Навукова-практычныя цэнтры павінны стаць асновай Акадэміі навук, галоўнымі інавацыйнымі структурамі. Іх неабходна фарміраваць на перыяд 3—5 гадоў пад прарыўныя інавацыйныя праекты, задачы нацыянальнага маштабу, лічыць прэм'ер-міністр. "Ёсць нямала крытыкаў, якія асноўную ўвагу ўдзяляюць структурным і арганізацыйным пераўтварэнням НАН Беларусі, лічачы гэта амаль што не галоўным пытаннем: колькі і якіх інстытутаў ліквідаваць, каго з кім аб'яднаць, — сказаў ён. — У сучасным свеце жорсткія структуры ў навуцы адыходзяць у мінулае. Сёння для інтэлектуальнай міграцыі вучонаму не патрэбна нават пакідаць краіну. Узровень развіцця інфармацыйных тэхналогій дае магчымасць чалавеку, геаграфічна застаючыся ў Беларусі, інтэлектуальна працаваць на рынак Еўропы, Азіі, ЗША". Гэта новыя магчымасці ўключэння ў глабальныя ланцужкі стварэння ведаў, інавацый, вартасці.

На думку кіраўніка ўрада, у Беларусі трэба пераходзіць да гібкіх арганізацыйных структур і міждысцыплінарных даследаванняў. Адпаведна канкурэнтаздольнымі і гібкімі павінны быць і сістэмы аплаты працы, фарміравання навуковага калектыву. "Я даручыў ДКНТ і Акадэміі навук унесці прапановы па заканадаўчым замацаванні магчымага прыцягнення ў такія структуры замежных вучоных з мінімальнымі бюракратычнымі фармальнасцямі", — расказаў Міхаіл Мясніковіч.